УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_______________ А.І.Жук
«___» _______________ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД 31-1-91/2024/вуч.

# ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЕ КРАІНАЗНАЎСТВА

**Вучэбная праграма ўстановы адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура)**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбнага плану па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура), зацверджанага 23.02.2023, рэг. № 048 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Т.П.Хоміч, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
У.І.Куліковіч, дацэнт кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

В.В.Урбан, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» ____________ Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 от 29.10.2024 г.)

Загадчык кафедры ________________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 2 ад 24.12 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела ______________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура).

Мастацкае слова заўсёды трывае гістарычную, духоўную і матэрыяльную сувязь з пэўнай краінай. Нацыянальная літаратура – гэта своеасаблівае люстэрка жыцця і працы, гаспадарчай дзейнасці, грамадскага і культурнага развіцця народа, адлюстраванне яго жыццёвага вопыту, самапазнання і светаўспрымання, асаблівасцей мыслення і псіхікі, маральна-этычных і эстэтычных нормаў. Літаратура дапамагае зведаць краіну, а краіна, яе нацыянальна-культурны код, спрыяе, у сваю чаргу, пазнанню літаратуры і тых, хто стварае яе – пісьменнікаў.

Прадметам вучэбнай дысцыпліны «Літаратуразнаўчае краіназнаўства», якая з’яўляецца дапаможнай у сістэме літаратуразнаўчых дысцыплін, выступаюць дыялектычныя ўзаемасувязі беларускай літаратуры з духоўнай і матэрыяльнай прасторай (тэрыторыяй) пэўнага рэгіёна і краіны ў цэлым.

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне і пашырэнне ведаў пра беларускі літаратурны працэс у краіназнаўчых аспектах (з улікам нацыянальна-гістарычных асаблівасцей культуры рэгіёнаў і краіны ў цэлым).

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны**:**

1) даць студэнтам веды ў галіне гісторыі літаратуразнаўчага краіназнаўства і краязнаўства ў Беларусі;
2) сфарміраваць разуменне перспектыўнасці краіназнаўчых ведаў у асэнсаванні літаратурных з’яў і літаратурнага працэсу;
3) прадставіць навукова-абгрунтаваны падыход да рэгіянальнага прынцыпу ў літаратуразнаўчым аналізе мастацкага твора і вывучэнні літаратуры ў цэлым;
4) навучыць арыентавацца ў свеце беларускай літаратуры ў суадносінах з культурна-гістарычнай сітуацыяй, рэгіянальным фактарам;
5) пазнаёміць будучых настаўнікаў-славеснікаў з педагагічнымі і выхаваўчымі магчымасцямі літаратурна-краязнаўчай працы;
6) выпрацаваць асобныя навыкі практычнай дзейнасці ў галіне літаратурнага краязнаўства.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.**

Вучэбная дысцыпліна «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» адносіцца да модулю «Тэарэтычныя і дапаможныя аспекты літаратуразнаўства» і ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі.

Вучэбная дысцыпліна «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» ўзаемадзейнічае з такімі дысцыплінамі, як «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў», «Філалагічны аналіз мастацкага тэксту», «Методыка выкладання беларускай літаратуры», дапаўняе і паглыбляе ўменні

і навыкі атрыманыя ў межах вучэбных дысцыплін «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Вусная народная творчасць».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць***:

– гісторыю і сучасны стан літаратурнага краіназнаўства і краязнаўства ў Беларусі;

– сутнасць і асновы рэгіянальнага прынцыпу ў літаратуразнаўчым аналізе;

– рэгіянальныя асаблівасці ў творах беларускіх пісьменнікаў-класікаў і пісьменнікаў-землякоў;

– віды літаратурна-краязнаўчых крыніц;

– асноўныя літаратурныя музеі Беларусі і рэгіёна, дакументальны і прадметны матэрыял музея пэўнай мясцовасці;

– галоўныя культурна-асветніцкія цэнтры Беларусі і рэгіёна, іх функцыі і ролю ў арганізацыі і правядзенні краязнаўчых мерапрыемстваў;

– агульныя метады і прыёмы вядзення краязнаўчай работы;

– методыку арганізацыі літаратурна-краязнаўчай працы ў школе;

***умець:***

– ідэнтыфікаваць краіназнаўчыя і краязнаўчыя выданні ў шэрагу літаратуразнаўчых;

– аналізаваць мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў у аспекце рэгіянальных традыцый;

– навукова і адэкватна ўспрымаць асаблівасці, значэнне і месца рэгіянальнай літаратуры ў нацыянальным літаратурным працэсе;

– збіраць і сістэматызаваць краязнаўчы матэрыял;

– арганізоўваць літаратурна-краязнаўчую працу ў школе;

***валодаць:***

– навыкамі крытычнага аналізу і інтэрпрэтацыі мастацкага твора;

– адпаведным паняційным і тэрміналагічным апаратам;

– уменнем апрацоўкі сабранага матэрыялу.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступнай кампетэнцыі:

СК 11. Прымяняць асноўныя метады і прыёмы аналіза літаратурнага тэксту з мэтай цэласнага ўяўлення пра яго моўную, культуралагічную і гістарычную сутнасць.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» адведзена:

– для дзённай формы атрымання адукацыі 108 гадзін, з іх 56 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах занятасці:

лекцыі – 28 гадзін, практычныя заняткі – 28 гадзін. На самастойную работу студэнтаў адведзена 52 гадзіны.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая форма атэстацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме заліка ў IV семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Асновы літаратуразнаўчага краіназнаўства

***Тэма 1.1 Сутнасць літаратуразнаўчага краіназнаўства***

1.1.1 Паняцці *краіназнаўства, краязнаўства, краязнавец.* Краіназнаўства як вучэбны прадмет. Комплекснае і галіновае краязнаўства. Формы сучаснага краязнаўства (навуковае, грамадскае, школьнае). Літаратуразнаўчае краіназнаўства як дапаможная галіна літаратуразнаўства. Аб’ект і прадмет літаратуразнаўчага краязнаўства (жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, літаратурны твор, рукапісы, рэгіянальны фальклор і інш.). Асноўныя метады літаратурна-краязнаўчай дзейнасці (метад працы з крыніцамі, метад палявых даследаванняў і інш.). Афармленне вынікаў праведзенай краязнаўчай працы.

***Тэма 1.2 Гісторыя станаўлення і развіцця комлекснага і літаратуразнаўчага краязнаўства ў Беларусі***

1.2.1 Вытокі краіназнаўства. Перыядызацыя гісторыі краязнаўства ў Беларусі. Этап назапашвання краязнаўчых матэрыялаў ў IX – XVIII стст. Летапісцы як прадвеснікі краязнаўчага руху («Хроніка Быхаўца», «Баркулабаўскі летапіс», «Магілёўская хроніка» і інш.). Ф. Скарына аб родным краі. Беларускі край у «Песні пра зубра» М. Гусоўскага. Збіральніцкая дзейнасць Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Тызенгаўзаў, Агінскіх. Станаўленне і развіццё краязнаўства ў XIX – пачатку XX стст. Культурна-грамадскія перадумовы краязнаўчай працы ў пачатку XIX ст.. Краязнаўчая дзейнасць ў Віленскім універсітэце (Віленскі музей старажытнасцей, Археалагічная камісія). Унёсак у вывучэнне беларускага краю Адама Кіркора, Аляксандра Рыпінскага, Яна Чачота, Яна Баршчэўскага. Краязнаўчыя і літаратуразнаўчыя нарысы У. Сыракомлі, В. Каратынскага. Значэнне дзейнасці газеты «Наша ніва» ў актывізацыі краязнаўчага руху ў пачатку XX ст. Унёсак Я. Карскага ў развіццё беларусазнаўства. Роля чытанак для школы Цёткі, Я. Коласа і і інш. у зараджэнні школьнага краязнаўства.

1.2.2 Краязнаўчы рух у 1920-я – 1930-я гг. «Залатое дзесяцігоддзе» ў развіцці краязнаўства. Масавасць краязнаўчага руху, яго дзяржаўная падтрымка ў першай палове дзесяцігоддзя. Краязнаўчыя гурткі. Роля Інстытута беларускай культуры ў арганізацыі краязнаўчага руху. 1-я Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя (1924). 1-ы Усебеларускі краязнаўчы з’езд (1926). Выданне часопісаў «Наш край» і «Асьвета». Пашырэнне ідэй краязнаўства М. Касяровічам. Актыўныя арганізатары і ўдзельнікі краязнаўчага руху: Я. Колас, М. Гарэцкі, З. Бядуля, К. Крапіва, А. Мрый і інш. Усебеларускія краязнаўчыя канферэнцыі (1929, 1930), абвешаны імі новы курс краязнаўства. Згортванне краязнаўчай працы ў 1930-я гады, яго прычыны.

1.2.3 Асноўныя тэндэнцыі развіцця краязнаўства ў другой палове 1940-х – 1990-я гг. Краязнаўства пасля Вялікай Айчыннай вайны. Развіццё

краязнаўства ў школах і ВНУ. Стварэнне Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1965). Выданне «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Пытанне пра стварэнне Беларускага краязнаўчага таварыства. Збор краязнаўчых матэрыялаў і напісанне кніг серыі «Памяць». Узмацненне рэгіянальнага падыходу. Краязнаўчая дзейнасць вучоных-літаратуразнаўцаў, настаўнікаў-славеснікаў (У. Калеснік, А. Мальдзіс, А. Белакоз і інш.).

1.2.4 Краіназнаўства на сучасным этапе. Агульныя тэндэнцыі развіцця сучаснага краіназнаўства. Павелічэнне колькасці лакальных даследаванняў. Складванне устойлівай традыцыі рэгіянальных навуковых канферэнцый. Літаратуразнаўчае краіназнаўства ў сучасных СМІ. Рэспубліканскія мерапрыемствы, накіраваныя на пашырэнне ведаў пра літаратурную Беларусь (штогадовае свята Дзень беларускага пісьменства). Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі (2020), яго рэзалюцыя.

***Тэма 1.3 Літаратурна-краіназнаўчыя крыніцы***

1.3.1 Распаўсюджванне ведаў пра ўзаемадзеянне літаратуры з жыццём пэўнай мясцовасці або Беларусі ў цэлым. Роля выданняў «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва» (у 5 т.), «Беларускія пісьменнікі» (у 6 т.) у пашырэнні і паглыбленні ведаў у галіне літаратуразнаўчага краіназнаўства. Шматтомныя серыі «Беларусь літаратурная», «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» і інш. – асаблівасці выданняў. Мастацка-дакументальныя творы пра пісьменнікаў (С. Александровіча, Л. Арабей і інш.). Летапісы жыцця і творчасці беларускіх класікаў, зборнікі пісьменніцкіх аўтабіяграфій («Пяцьдзесят чатыры дарогі» (1963), «Пра час і пра сябе» (1966) і інш.).

***Тэма 1.4. Роля музеяў у літаратуразнаўчым краіназнаўстве***

1.4.1 Тыпалогія музеяў. Літаратурныя музеі як навукова-даследчыя і навукова-метадычныя цэнтры краіназнаўства. Значэнне і функцыі літаратурнага музея. Агляд дзяржаўных літаратурных музеяў на тэрыторыі сучаснай Беларусі (Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры). Заснаванне і адкрыццё музеяў, іх калекцыі. Навукова-даследчая праца супрацоўнікаў. Мінскія і раённыя філіялы музеяў (Маладзечанскі, Лагойскі, Сталбцоўскі і інш. раёны). Філіялы, аддзелы, кампазіцыі пры гісторыка-краязнаўчых музеях, прысвечаныя пісьменнікам-землякам. Літаратурныя і літаратурна-краязнаўчыя музеі на грамадскіх пачатках. Школьныя (народныя) музеі Беларусі.

***Тэма 1.5 Літаратурна-мастацкі твор як аб’ект літаратуразнаўчага краіназнаўства***

1.5.1 Паняцце *літаратурны рэгіяналізм*. Культурна-гістарычныя рэгіёны на карце сучаснай Беларусі (Паазер’е, Панямонне, Цэнтральны рэгіён, Падняпроўе, Палессе заходняе і ўсходняе). Засваенне рэгіянальнага матэрыялу беларускай літаратурай, кампаненты рэгіянальнага ў творах айчынных аўтараў (аўтабіяграфізм, тапанімічнае багацце твораў, пейзаж, вобразы ландшафту, рэгіянальныя фальклорныя сюжэты, рэаліі мясцовага

побыту і культуры, рэгіяналізмы). Семантыка паняцця *рэгіянальны субстрат* (А. Бельскі).

**Раздзел 2. Рэгіянальнае літаратурнае краіназнаўства**

***Тэма 2.1 Беларуская літаратура ў яе лакальна-рэгіянальнай спецыфіцы***

2.1.1 Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёнаў Беларусі. Вусная народная творчасць рэгіёнаў. Мясцовыя легенды, паданні, казкі, адлюстраванне ў іх гісторыі з’яўлення назваў рэк, азёр і населеных пунктаў. Адметнасць мовы рэгіёнаў і яе выкарыстанне ў творах пісьменнікаў.

Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Беларускія летапісы пра падзеі і дзеячаў вобласцяў, раёнаў. Рэгіянальнае ў літаратуры эпохі Адраджэння. Рэгіянальная літаратура ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мясцовыя друкарні. Творы беларускіх пісьменнікаў на беларускай і польскай мовах. Рускія пісьменнікі і Беларусь. Адметнасць рэгіянальнай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя. Рэгіянальная літаратура ў час Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Рэгіянальная літаратура на сучасным этапе.

Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. Стварэнне ў абласных і раённых цэнтрах літаратурных аб’яднанняў і аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выданне альманахаў. Рэгіянальная літаратура ў мясцовым друку. Рэгіянальныя літаратурныя прэміі. Ушанаванне памяці знакамітых пісьменнікаў.

2.1.2 Літаратурныя сцежкі беларускай сталіцы. Мінск у нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменнікаў. Ушанаванне памяці пісьменнікаў. Мінск у творах мастацкай літаратуры.

***Тэма 2.2 Культурныя і літаратурныя адметнасці роднага краю***

2.1.1 Літаратурная гісторыя і сучасны літаратурны ландшафт «малой радзімы», іх месца і значэнне ў нацыянальным літаратурным працэсе. Узаемаадносіны пісьменнікаў-землякоў і роднага краю, услаўленне родных мясцін у творах. Рэгіянальны аспект (прырода, помнікі, мова, людзі і інш.) у творах пісьменнікаў-землякоў. Родныя мясціны як крыніца натхнення для пісьменніка. Родныя, блізкія і знаёмыя пісьменнікаў-землякоў. Культурныя і літаратурныя адметнасці краю.

**Раздзел 3. Арганізацыя літаратурна-краязнаўчай дзейнасці ў школе**

***Тэма 3.1 Краязнаўчы прынцып выкладання на ўроках беларускай літаратуры***

3.1.1 Значэнне краязнаўчых ведаў ў эстэтычным і патрыятычным выхаванні вучняў. Краязнаўчыя матэрыялы на ўроках пры вывучэнні біяграфіі пісьменніка і гісторыі літаратуры. Адбор краязнаўчага матэрыялу (навуковасць і дакладнасць фактаў, іх пазнаваўчы і выхаваўчы патэнцыял).

### *Тэма 3.2. Літаратурнае краязнаўства ў пазакласнай дзейнасці*

3.2.1 Формы і віды літаратурна-краязнаўчай працы. Літаратурная экскурсія.

Віды экскурсій (музейныя, біяграфічныя, па літаратурных мясцінах, комплексныя). Арганізацыйна-творчыя формы літаратурна-краязнаўчай работы (падрыхтоўка альбомаў, выстаў, стварэнне біяграфічных і літаратурных карт, друкаваных і электронных літаратурных выданняў, альманахаў, інш.). Літаратурна-краязнаўчы гурток, яго віды (фальклорны, фальклорна-этнаграфічны, гісторыка-літаратурны; прысвечаны жыццю і творчасці пісьменніка-земляка, мясцовым літаратурным згуртаванням). Формы працы ў літаратурна-краязнаўчым гуртку (лекцыйная, семінарская, экспедыцыйная, навукова-даследчая, літаратурна-творчая, афарміцельская, арганізацыйна-творчая). Прымяненне краязнаўчых матэрыялаў у арганізацыі літаратурнай вечарыны, квэст-гульні, інтэрнэт-віктарыны. Стварэнне літаратурна-краязнаўчага музея і развіццё ўжо існуючага. Збор, улік і захаванне матэрыялаў. Экспазіцыя школьнага музея. Экскурсія ў музеі. Музейная дакументацыя. Выкарыстанне матэрыялаў літаратурна-краязнаўчага музея ў вучэбна-выхаваўчай працы школы.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЕ КРАІНАЗНАЎСТВА» (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, пытанні па тэме | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная (пазааўдыторная) работа | Метадычныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **1** | **ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЕ КРАІНАЗНАЎСТВА** | **28** | **28** | **52** | | | |
| **1** | **Асновы літаратуразнаўчага краіназнаўства** | **18** | **10** | **20** | | | |
| **1.1** | ***Сутнасць літаратуразнаўчага краіназнаўства*** | ***4*** | | ***2*** | | | |
| 1.1.1 | 1. Паняцці *краіназнаўства*, *краязнаўства*, *краязнавец*.<br>2. Краіназнаўства як вучэбны прадмет.<br>3. Комплекснае і галіновае краязнаўства.<br>4. Формы сучаснага краіназнаўства.<br>5. Літаратуразнаўчае краіназнаўства як дапаможная галіна літаратуразнаўства.<br>6. Асноўныя метады літаратурна-краязнаўчай дзейнасці. | 4 | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя № 1. | [3]<br>[4] | Тэсціраванне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.2** | ***Гісторыя станаўлення і развіцця комлекснага і літаратуразнаўчага краязнаўства ў Беларусі*** | ***6*** | ***2*** | ***8*** | | | |
| 1.2.1 | 1. Перыядызацыя гісторыі краязнаўства Беларусі.<br>2. Этап назапашвання краязнаўчых матэрыялаў ў IX – XVIII стст.<br>3. Станаўленне і развіццё беларусазнаўства і краязнаўства ў XIX ст. – пач. XX ст.<br>4. Унёсак у вывучэнне беларускага краю пісьменнікаў XIX ст.<br>5. Краязнаўчы рух вакол газеты «Наша ніва».<br>6. Унёсак Я. Карскага, Цёткі, Я. Коласа і інш. у развіццё айчыннага краіназнаўства. | 2 | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя № 2 | [2]<br>[9]<br>[10] | Тэсціраванне |
| 1.2.2 | 1. Краязнаўчы рух у 1920-я – 1930-я гг.<br>2. Роля Інстытута беларускай культуры ў арганізацыі краязнаўчай працы.<br>3. Часопісы «Наш край» і «Асьвета».<br>4. Пашырэнне ідэй краязнаўства М. Касяпровічам.<br>5. Актыўныя арганізатары і ўдзельнікі краязнаўчага руху – пісьменнікі.<br>6. Згортванне краязнаўчай працы ў 1930-я гады, яго прычыны. | 2 | 1 | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя № 2 | | Тэсціраванне; даклады |
| 1.2.3 | 1. Асноўныя тэндэнцыі развіцця краязнаўства ў другой палове 1940-х – 1990-я гг.<br>2. Краязнаўства пасля Вялікай Айчыннай вайны. | 1 | 1 | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя № 2; кнігі серыі «Памяць» | | Тэсціраванне; даклады |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Стварэнне Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1965).<br>4. Збор краязнаўчых матэрыялаў і напісанне кніг серыі «Памяць».<br>5. Краязнаўчая дзейнасць вучоных-літаратуразнаўцаў, настаўнікаў-славеснікаў. | | | | | | |
| 1.2.4 | 1. Агульныя тэндэнцыі ў развіцці сучаснага країназнаўства.<br>2. Літаратуразнаўчае країназнаўства ў сучасных СМІ.<br>3. Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі (2020), яго рэзалюцыя. | 1 | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя № 2; нумары часопіса «Роднае слова»: краязнаўчыя выданні А. Карлюкевіча, А. Пяткевіча і інш. | | Тэсціраванне |
| **1.3** | ***Літаратурна-країназнаўчыя крыніцы*** | | ***2*** | ***4*** | | | |
| 1.3.1 | 1. Роля выданняў «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва» (у 5 т.), «Беларускія пісьменнікі» (у 6 т.) у пашырэнні і паглыбленні ведаў у галіне літаратуразнаўчага країназнаўства.<br>2. Шматтомныя серыі «Беларусь літаратурная», «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» і інш. – асаблівасці выданняў.<br>3. Мастацка-дакументальныя творы пра пісьменнікаў.<br>4. Летапісы жыцця і творчасці беларускіх класікаў, зборнікі пісьменніцкіх аўтабіяграфій. | | 2 | 4 | Кнігі (адпаведныя тэме і зместу лекцыі) | [5]<br>[11] | Вуснае апытванне; праверка бібліяграфічнага спіса |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.4** | ***Роля музеяў у літаратуразнаўчым краіназнаўстве*** | ***4*** | ***4*** | ***4*** | | [4] | |
| 1.4.1. | 1. Тыпалогія музеяў.<br>2. Літаратурныя музеі як навукова-даследчыя і навукова-метадычныя цэнтры краіназнаўства.<br>3. Агляд дзяржаўных літаратурных музеяў на тэрыторыі сучаснай Беларусі<br>4. Філіялы, аддзелы, кампазіцыі пры гісторыка-краязнаўчых музеях, прысвечаныя пісьменнікам-землякам.<br>5. Школьныя (народныя) музеі Беларусі. | 4 | 4 | | Мультымедыйная прэзентацыя № 3 | | Даклады (групавая работа) |
| **1.5** | ***Літаратурна-мастацкі твор як аб'ект літаратуразнаўчага краіназнаўства*** | ***4*** | ***2*** | ***2*** | | | |
| 1.5.1 | 1. Паняцце *літаратурны рэгіяналізм*.<br>2. Культурна-гістарычныя рэгіёны на карце сучаснай Беларусі.<br>3. Засваенне рэгіянальнага матэрыялу беларускай літаратурай, кампаненты рэгіянальнага ў творах айчынных аўтараў.<br>4. Семантыка паняцця *рэгіянальны субстрат* (А. Бельскі). | 4 | 2 | 2 | Ксеракопія артыкула А.Бельскага «Рэгіянальны субстрат і яго роля <…>» (ч-с «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта», 2001, № 1) | [1]<br>[2] | Вуснае апытванне |
| **2** | **Рэгіянальнае літаратурнае краіназнаўства** | **6** | **14** | **24** | | | |
| **2.1** | ***Беларуская літаратура ў яе лакальна-рэгіянальнай спецыфіцы*** | ***6*** | ***4*** | ***12*** | | | |
| 2.1.1 | 1. Літаратурныя і культурныя традыцыі | 4 | 2 | 8 | Карта Рэспублікі | [6] | Вуснае апытванне; |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | рэгіёнаў Беларусі (Брэстчына, Віцебшчына, Гомельшчына, Гродзеншчына, Магілёўшчына, Міншчына).<br>2. Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>3. Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. | | | | Беларусь; тэксты мастацкіх твораў; мультымедыйная прэзентацыя | [7]<br>[10]<br>[11] | тэсціраванне |
| 2.1.2 | 1. Мінск у нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>2. Мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменнікаў.<br>3. Ушанаванне памяці пісьменнікаў.<br>4. Мінск у творах мастацкай літаратуры. | 2 | 2 | 4 | Карта горада Мінска; тэксты мастацкіх твораў | | Вуснае апытванне |
| **2.2** | ***Культурныя і літаратурныя адметнасці роднага краю*** | | ***10*** | ***12*** | | | |
| 2.2.1 | 1. Літаратурная гісторыя і сучасны літаратурны ландшафт «малой радзімы». 2. Узаемаадносіны пісьменнікаў-землякоў і роднага краю, услаўленне родных мясцін у творах.<br>3. Рэгіянальны аспект у творах пісьменнікаў-землякоў. | | 10 | 12 | Карта Рэспублікі Беларусь; мультымедыйнае абсталяванне | [5]<br>[6]<br>[7]<br>[11] | Рэфераты, прэзентацыі |
| **3** | **Арганізацыя літаратурна-краязнаўчай дзейнасці ў школе** | **4** | **4** | **8** | | | |
| **3.1** | ***Краязнаўчы прынцып выкладання на ўроках беларускай літаратуры*** | ***1*** | ***2*** | ***4*** | | | |
| 3.1.1 | 1. Значэнне краязнаўчых ведаў ў эстэтычным і патрыятычным выхаванні вучняў. | 1 | 2 | 4 | Кніга В. Ляшук «Літаратурнае краязнаўства ў | | Вуснае апытванне; творчае заданне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Краязнаўчыя матэрыялы на ўроках літаратуры.<br>3. Адбор краязнаўчага матэрыялу. | | | | школе» (Мінск, 1991) | | |
| **3.2** | ***Літаратурнае краязнаўства ў пазакласнай дзейнасці*** | ***3*** | ***2*** | ***4*** | | | |
| 3.2.1 | 1. Літаратурная экскурсія..<br>2. Арганізацыйна-творчыя формы літаратурна-краязнаўчай работы.<br>3. Літаратурна-краязнаўчы гурток, яго віды.<br>4. Прымяненне краязнаўчых матэрыялаў у арганізацыі літаратурнай вечарыны, квэст-гульні, інтэрнэт-віктарыны.<br>5. Стварэнне літаратурна-краязнаўчага музея і развіццё ўжо існуючага. | 3 | 2 | 4 | Кніга С. Холева «Да родных вытокаў: у дапамогу. краязнаўцу» (Мінск, 2019) | | Вуснае апытванне |
| | **Усяго гадзін** | **28** | **28** | **52** | | | **Залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Корзюк, А. А. Краеведение Беларуси в вопросах и ответах : пособие / А. А. Корзюк. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2021. – 84 с.

2. Літаратурнае краязнаўства : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» / склад. А. І. Лугоўскі // Репозиторий БГПУ. – URL: http://elib.bspu.by/handle/doc/2535 (дата звароту: 03.12.2024).

3. Праскаловіч, В. У. Методыка выкладання беларускай літаратуры. Практыкум : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў вузаў / В. У. Праскаловіч. – 2-е выд. – Мн. : Беларус. дзярж. ун-т, 2023. – 167 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. / рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – 2-е выд., дапрац. – Мн. : Беларус. навука, 2006–2007. – 2 т.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мн. : Беларус. навука, 2002–2015. – 4 т.

3. Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1941–1991) / А. А. Гужалоўскі. – Мн. : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2004. – 192 с.

4. Карлюкевіч, А. Краязнаўчы рэсурс у вывучэнні беларускай літаратуры / А. Карлюкевіч. – Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2015. – 295 с.

5. Карлюкевіч, А. Праз шкельца гісторыі : нарысы / А. Карлюкевіч. – Мн. : Звязда, 2023. – 238 с.

6. Кулажанка, Л. Літаратурныя мясціны Беларусі : краязнаўчы давед. : дапам. для настаўнікаў : у 3 кн. / Л. Я. Кулажанка, А. І. Мальдзіс, С. Б. Сачанка ; рэд. А. І. Мальдзіс. – Мн. : БелЭн, 2000. – Кн. 1 : Брэсцкая, Віцебская і Гомельская вобласці. – 286 с.

7. Лапцёнак, І. Б. Літаратурнае краязнаўства : вучэб.-метад. матэрыялы / І. Б. Лапцёнак. – Мн. : ІВЦ Мінфіна, 2017. – 43 с.

8. Ляшук, В. Я. Літаратурнае краязнаўства ў школе / В. Я. Ляшук. – Мн. : Выш. шк., 1991. – 150 с.

9. Малая радзіма ў творчасці беларускіх пісьменнікаў / рэдкал.: Я. А. Гарадніцкі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2022. – 2019 с.

10. Русак, В. У. Краіназнаўства і краязнаўства : вучэб.-метад. дапам. / В. У. Русак. – Мн. : Беларус. дзярж. тэхн. ун-т, 2011. – 226 с.

11. Тэксталогія і яе дапаможныя навукі : вучэб.-метад. дапам. / В. П. Рагойша, М. П. Кенько, І. У. Ківель [і інш.] ; пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мн. : Беларус. дзярж. ун-т, 2015. – 231 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЕ КРАІНАЗНАЎСТВА »

Самастойная работа студэнтаў з’яўляецца адным з найважнейшых і найбольш эфектыўных элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта сумесная дзейнасць выкладчыка і студэнта, накіраваная на самастойнае авалоданне студэнтам часткай дысцыпліны пры дапамозе спецыяльна распрацаванага навукова-метадычнага забеспячэння, якая прадугледжвае арганізацыю дадатковых кансультацый і спецыяльных відаў кантролю з боку выкладчыка, акрамя прадугледжаных вучэбным планам форм прамежкавага і выніковага кантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне.

Мэта самастойнай работы студэнтаў: развіццё ўнутраных псіхалагічных механізмаў інтэлектуальнай актыўнасці студэнтаў, іх пазнавальных здольнасцей шляхам уключэння ў ініцыятыўную вучэбную і навукова-прафесійную дзейнасць, павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў ВНУ праз фарміраванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Віды самастойнай працы студэнтаў:

а) рэпрадуктыўная (вучэбная, кансультацыйная), якая ўключае выкананне заданняў з вучэбнай літаратуры.

б) прадуктыўная (даследчая), якая ўключае выкананне навукова-даследчай работы; вывучэнне, анатаванне, рэферыраванне дадатковай вучэбнай літаратуры; падрыхтоўку да канферэнцый і г.д.

Формы самастойнай работы студэнтаў: падрыхтоўка да лекцый і практычных заняткаў; вывучэнне вучэбных дапаможнікаў; вывучэнне тэм і праблем, якія не выносяцца на лекцыі і практычныя заняткі; падрыхтоўка рэфератаў, паведамленняў і дакладаў; складанне бібліяграфіі. і рэферыраванне па самастойна вывучанай тэме.

**Прыкладны пералік і кароткая характарыстыка ацэначных сродкаў**

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| 1. | Рэферат | Прадукт самастойнай работы студэнта – кароткі выклад у пісьмовай форме атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай тэмы, у якім аўтар перадае змест матэрыялу, прыводзіць розныя пункты гледжання, а таксама ўласны погляд на яе | Тэматыка рэфератаў |
| 2. | Паведамленне | Сродак, які спрыяе ацэнцы ўмення студэнта пісьмова выкладаць сутнасць вызначанай праблемы, рабіць высновы, | Тэматыка паведамленняў |

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| | | якія абагульняюць аўтарскую пазіцыю па пэўнай праблеме | |
| 3. | Даклад | Прадукт самастойнай работы студэнта, публічнае выступленне з прэзентацыяй атрыманых вынікаў аналізу пэўнай тэмы ці праблемы | Тэматыка дакладаў |
| 4. | Мультымедыйная прэзентацыя | Прадстаўленне зместу вучэбнай задачы з выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій | Тэматыка прэзентацый |
| 5. | Бібліяграфічны спіс | Прадукт самастойнай работы студэнта, які ўяўляе сабой спіс літаратуры па пэўнай тэме ці праблеме, неабходнай для яе вывучэння | Рэкамендацыі да складання бібліяграфічнага спіса |
| 6. | Творчае заданне | Часткова рэгламентаванае заданне, якое мае нестандартнае рашэнне, дазваляе дыягнаставаць уменні інтэграваць атрыманыя веды. Выконваецца індывідуальна, афармляецца пісьмова | Рэкамендацыі да выканання творчага задання. |

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ
**дзённая форма атрымання адукацыі**

| п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | *Тэма 1.1.* Сутнасць літаратуразнаўчага краіназнаўства | 2 | Пазнаёміцца з крыніцамі, прапанаванымі ў спісе асноўнай літаратуры па дысцыпліне. Вывучыць асноўныя паняцці па тэме. | Падрыхтоўка паведамленняў. |
| 2. | *Тэма 1.2.* Гісторыя станаўлення і развіцця комлекснага і літаратуразнаўчага краязнаўства ў Беларусі | 8 | Вывучыць неабходныя па тэме гістарычныя факты, падзеі, прозвішчы.<br>Прачытаць краязнаўчыя і літаратуразнаўчыя нарысы Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, вызначыць іх ролю ў вобласці ведаў пра Беларусь.<br>Пазнаёміцца з краязнаўчымі працамі і дзейнасцю М. Каспяровіча, У. Калесніка, А. Белакоза, інш. | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў. |
| 3. | *Тэма 1.3.* Літаратурна-краіназнаўчыя крыніцы | 4 | Пазнаёміцца з выданнямі на выбар: *летапіс жыцця і творчасці беларускіх пісьменнікаў* (Я. Колас, М. Гарэцкі, інш.), кнігі серыі ЖЗЛБ, зборнікі пісьменніцкіх аўтабіяграфій («Пяцьдзесят чатыры дарогі»; «Пра час і пра сябе»; «Вытокі песні»; «З росных сцяжын»), інш.; вызначыць асаблівасці іх зместу і формы.<br>Падрыхтаваць спіс літаратурна-краязнаўчых крыніц па сваім рэгіёне. | Падрыхтоўка паведамленняў; складанне бібліяграфічнага спіса. |
| 4. | *Тэма 1.4.* Роля музеяў у літаратуразнаўчым краіназнаўстве | 4 | Наведаць (групай па 2-4 студэнты) адзін з Дзяржаўных літаратурных музеяў, прааналізаваць магчымасці музейнай экскурсіі ў школьным вучэбна-выхаваўчым працэсе. | Падрыхтоўка дакладаў, прэзентацый. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5. | *Тэма 1.5.* Літаратурна-мастацкі твор як аб’ект літаратуразнаўчага краіназнаўства | 2 | Прачытаць артыкул А. Бельскага «Рэгіянальны субстрат і яго роля ў стварэнні нацыянальнага вобраза свету: на матэрыяле беларускай паэзіі» (ч-с «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта», серыя 4, 2001, № 1, с. 15–18); вызначыць семантыку паняцця «рэгіянальны субстрат».<br>Адшукаць і прывесці прыклады рэгіянальных кампанентаў у творах мастацкай літаратуры. | Падрыхтоўка паведамленняў. |
| 6. | *Тэма 2.1.* Беларуская літаратура ў яе лакальна-рэгіянальнай спецыфіцы | 12 | Вывучыць неабходныя па тэме культурна-гістарычныя факты, літаратурныя з’явы. Прачытаць рэкамендаваныя выкладчыкам мастацкія творы. | Падрыхтоўка паведамленняў.<br>. |
| 7. | *Тэма 2.2.* Культурныя і літаратурныя адметнасці роднага краю | 12 | Вызначыць і апісаць літаратурна-краязнаўчыя аб’екты «малой радзімы». | Падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый. |
| 8. | *Тэма 3.1.* Краязнаўчы прынцып выкладання на ўроках беларускай літаратуры | 4 | Пазнаёміцца з кнігай В. Ляшук «Літаратурнае краязнаўства ў школе» (1991), прывесці прыклады выкарыстання краязнаўчых матэрыялаў на ўроку беларускай літаратуры. | Падрыхтоўка паведамленняў. |
| 9. | *Тэма 3.2.* Літаратурнае краязнаўства ў пазакласнай дзейнасці | 4 | Падрыхтаваць літаратурна-краязнаўчую віктарыну (на аснове літаратурна-культурнай спадчыны свайго рэгіёна, раёна, горада, інш.) | Творчае заданне. |
| | **Усяго за IV семестр** | **52** | | |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

У якасці сродкаў дыягностыкі выніковасці навучання па вучэбнай дысцыпліне «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» прапануюцца наступныя:

- вусная праверка атрыманых ведаў;
- праверка вынікаў тэсціравання;
- ацэнка ўзроўню абароны падрыхтаваных паведамленняў, дакладаў і рэфератаў;
- праверка творчага задання.

Рэкамендаваная форма выніковага кантролю – залік.

**Прыкладныя крытэрыі і паказчыкі ацэнкі выканання студэнтамі работ, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе бягучай атэстацыі і СР**

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| **Рэферат / паведамленне /даклад** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай літаратуры | – аб'ём навуковай літаратуры дастатковы;<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 2 заўвагі) |
| Сапраўднасць інфармацыі (дакладнасць, абгрунтаванасць, наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі) | – інфармацыя дакладная, абгрунтаваная, утрымлівае спасылкі на выкарыстаныя крыніцы інфармацыі;<br>– інфармацыя мае заўвагі па адным пункце з трох |
| Неабходнасць і дастатковасць інфармацыі | – прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў;<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| **Бібліяграфічны спіс** | |
| Аб’ём спіса | – аб’ём спіса літаратуры дастаковы (10 крыніц);<br>– аб’ём крыніц недастатковы (менш за 10 крыніц) |
| Сапраўднасць інфармацыі | – інфармацыя сапраўдная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| **Творчае заданне** | |
| Дакладнасць інфармацыі | – інфармацыя дакладная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Выразнасць, | – фармулёкі выразныя і лаканічныя; |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| лаканічнасць фармулёвак | – фармулёкі маюць не больш за 2 заўвагі адпаведна пазначаным параметрам |
| **Тэсціраванне** | |
| Адпаведнасць адказаў тэме | – адказы поўнасцю адпавядаюць тэме (100%);<br>– адказы адпавядаюць тэме, але ёсць фактычныя недакладнасці (не больш за 20%) |
| **Мультымедыйная прызентацыя** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Падача матэрыялу (наяўнасць, дастатковасць і абгрунтаванасць графічнага афармлення: фотаздымкаў, відэаматэрыялаў, тэксту) | – падача матэрыялу поўнасцю адпавядае пазначаным параметрам;<br>– падача матэрыяла адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 2 заўвагі) |

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ДАКЛАДАЎ, ПАВЕДАМЛЕННЯЎ, ПРЭЗЕНТАЦЫЙ

1. Вобраз Беларусі ў краязнаўчых нарысах пісьменнікаў XIX стагоддзя (Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля, В. Каратынскі – на выбар студэнтаў).

2. Краязнаўчая дзейнасць грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў, вучоных і настаўнікаў XX ст. (Я. Колас, З. Бядуля, М. Каспяровіч, У. Калеснік, А. Белакоз і інш. – на выбар студэнтаў).

3. Зборнікі біяграфій пісьменнікаў як літаратурна-краіназнаўчыя крыніцы.

4. Летапіс жыцця і творчасці А. Куляшова як літаратурна-краіназаўчая крыніца.

5. Гісторыя стварэння, экспазіцыя Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

6. Рэгіянальны кампанент у творчасці беларускіх пісьменнікаў (Я. Колас, І. Мележ, Р. Барадулін і інш. – на выбар студэнта)

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТАЎ[1] І РЭКАМЕНДАЦЫІ ДА ІХ ПАДРЫХТОЎКІ

Культурныя і літаратурныя адметнасці роднага краю. (Пад паняццем «родны край» падразумяваецца родная вёска, горад, раён.)

У змесце рэферата могуць быць адлюстраваны:

- Літаратурныя тапонімы («літаратурныя» назвы вуліц, іншых аб’ектаў) з каментарыем-тлумачэннем да іх.
- Мясцовыя легенды і паданні пра паходжанне назвы роднай вёскі, мястэчка, раённага цэнтра.
- Жыццё пісьменнікаў-землякоў (класікаў, сучаснікаў…) на «малой радзіме», іх сувязь з роднымі мясцінамі.
- Успаміны мясцовых жыхароў пра пісьменнікаў-землякоў (пры магчымасці – інтэрв’ю).
- Звесткі аб прататыпах літаратурных герояў з ліку землякоў.
- Інфармацыя пра жыццёвыя і творчыя перасячэнні знакамітых пісьменнікаў з вашым родным раёнам.
- Агляд мастацкіх твораў, дзе згадваюцца, апісваюцца родныя мясціны, цытаты.

---

[1] Абарона рэферата абавязкова суправаджаецца дэманстрацыяй фота-, відэматэрыялаў на слайдах мультымедыйнай прэзентацыі (з гукавым суправаджэннем ці без яго), а таксама кніг, перыядычных выданняў і інш.

- Факты аб ўшанаванні памяці пра пісьменнікаў-землякоў, культурных дзеячаў (музеі, помнікі, мемарыялы, некропалі ў вёсцы/мястэчку/горадзе/раёне).
- Агляд сучаснага культурнага жыцця рэгіёна (рэгіянальныя літаратурныя аб'яднанні, літаратурныя выданні, мерапрыемствы).

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ДА СКЛАДАННЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА СПІСА

Бібліяграфічны спіс павінен утрымліваць не менш за 10 літаратурна-краязнаўчых крыніц па рэгіёне, да якога адносіцца населены пункт – месца нараджэння або пражывання студэнта. Афармленне спіса павінна адпавядаць патрабаванням ВАК РБ.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ДА ВЫКАНАННЯ ТВОРЧАГА ЗАДАННЯ

Творчае заданне ўяўляе сабой метадычную распрацоўку студэнтам віктарыны на тэму «Па літаратурных мясцінах роднага краю». Распрацоўка павінна ўключаць: мэту, задачы, сцэнарый.

## ПРЫКЛАДЫ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ

1. **Выберыце правільнае сцвярджэнне:**
   1) Краязнаўства – гэта комплекснае, усебаковае вывучэнне пэўнай тэрыторыі.
   2) Краязнаўства – комплекс навуковых дысцыплін, якія вядуць улік помнікам і памятным знакам у краіне.

2. **Прадметам літаратуразнаўчага краязнаўства з'яўляецца:**
   1) Край.    2) Літаратура.
3. **Працягніце пералік аб'ектаў літаратуразнаўчага краязнаўства:** *асоба пісьменніка ў кантэксце з пэўным краем*, ______________________
   ______________________________________

4. **Выберыце крыніцы літаратурна-краязнаўчага даследавання**:
   1) «Пяцьдзесят чатыры дарогі» : аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў.
   2) Арыстоцель «Паэтыка».
   3) «На зямлі Златавуста: Тураўшчына літаратурная».
   4) М. Мушынскі «Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа».
   5) В. Яцухна «Тэорыя літаратуры».

5. **Беларусазнаўчая калекцыя Храптовічаў – гэта**:
   1) Збор музейных прадметаў (зброя, габелены, слуцкія паясы, нумізматычны кабінет); архіў з дакументамі ВКЛ і Рэчы Паспалітай; бібліятэка, у якой налічвалася кала 20 тысяч тамоў кніг і мноства рукапісаў.
   2) Галерэя твораў мясцовых майстроў, арніталагічная калекцыя.
   3) Вялікая бібліятэка кніг, старажытных рукапісаў, карт па гісторыі Беларусі, Літвы і Польшчы, якой карысталіся А. Міцкевіч, Я. Чачот, У. Сыракомля.
6. **Першым сярод славянскіх вучоных паказаў, што беларусазнаўства выпрацавалася як навуковая сістэма:**
   1) Аляксандр Ельскі.
   2) Мітрафан Доўнар-Запольскі.
   3) Яўхім Карскі.
   4) Браніслаў Эпімах-Шыпіла.
7. **Рашэнне аб выданні першага краязнаўчага беларускага часопіса «Наш край» было прынята:**
   1) Цэнтральным бюро краязнаўства.
   2) Першым Усебеларускім краязнаўчым з’ездам.
   3) Віцебскім акруговым таварыствам краязнаўства.
8. **Выберыце правільнае меркаванне:**
   1) Росквіт школьнага краязнаўства ў 1960-я – 80-я гг. тлумачыцца задачамі, якія ставіў дзяржаўны ўрад: фарміраваць ідэалогію праз выхаванне моладзі, ахоўваць помнікі гісторыі і культуры.
   2) Росквіт школьнага краязнаўства ў 1960-я – 80-я гг. тлумачыцца рэзалюцыяй Першай Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі аб неабходнасці патрыятычнай прапаганды сярод моладзі.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Краіназнаўства як дапаможная навука. Комплекснае і галіновае краіназнаўства.
2. Формы сучаснага краязнаўства.
3. Літаратурнае краіназнаўства як дапаможная галіна літаратуразнаўства. Прадмет і аб’екты літаратурнага краязнаўства.
4. Метады літаратурна-краязнаўчай дзейнасці.
5. Перыядызацыя гісторыі краязнаўства ў Беларусі. Вытокі краязнаўства.
6. Назапашванне краязнаўчых матэрыялаў ў IX – XVIII стст. Збіральніцкая дзейнасць магнатаў.
7. Станаўленне краязнаўства ў XIX ст. Гурткі пры Віленскім універсітэце і краязнаўства.
8. Унёсак пісьменнікаў у вывучэнне беларускага краю ў XIX ст.
9. Газета «Наша ніва» (1906–1915) ў краязнаўчым руху.
10. Зараджэнне школьнага краязнаўства ў пачатку XX ст.
11. Арганізацыя краязнаўчага руху ў 1920-я гг. Першыя краязнаўчыя канферэнцыя, з’езд, часопіс.
12. Стан беларускага краязнаўства ў 1930-я гг.
13. Агульныя тэндэнцыі развіцця краіназнаўства пасля Вялікай Айчыннай вайны і ў наступныя дзесяцігоддзі савецкага перыяду.
14. Літаратурнае краязнаўства на сучасным этапе.
15. Краязнаўчая дзейнасць і працы… (асоба беларускага краязнаўцы на выбар).
16. Літаратурны музей як навукова-даследчы і навукова-метадычны цэнтр краіназнаўства. Дзяржаўныя літаратурныя музеі і іх філіялы.
17. Літаратурны рэгіяналізм. Рэгіянальныя кампаненты ў мастацкіх творах, іх магчымыя функцыі.
18. Рэгіянальны субстрат у мастацкім творы / творчасці пісьменніка (аналіз твора/ творчасці на выбар).
19. Выкарыстанне краязнаўчых матэрыялаў на ўроках беларускай літаратуры.
20. Арганізацыя літаратурнай экскурсіі ў пазашкольнай працы, яе значэнне.
21. Арганізацыя літаратурна-краязнаўчага гуртка ў школе, яго значэнне.
22. Школьны музей як форма літаратурна-краязнаўчай дзейнасці.
23. Літаратурныя мяціны Брэстчыны.
24. Літаратурныя мясціны Віцебшчыны.
25. Літаратурныя мясціны Гомельшчыны.
26. Літаратурныя мясціны Гродзеншчыны.

27. Літаратурныя мясціны Магілёўшчыны.
28. Літаратурныя мясціны Міншчыны.
29. Пісьменнікі Брэстчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
30. Пісьменнікі Віцебшчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
31. Пісьменнікі Гомельшчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
32. Пісьменнікі Гродзеншчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
33. Пісьменнікі Магілёўшчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
34. Пісьменнікі Міншчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
35. Літаратурныя мясціны беларускай сталіцы.
36. Мінск у творах мастацкай літаратуры.

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| № | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1. | ***залічана*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 2. | ***не залічана*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінай рабочай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне гэтай дысцыпліны | Прапановы кафедры аб зменах у змесце рабочай праграмы | Прынятае рашэнне кафедрай, якая распрацавала рабочую праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Уводзіны ў літаратуразнаўства» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Сутнасць літаратуразнаўчага краіназнаўства» ўзнаўляць веды студэнтаў пра іншыя дапаможныя дысцыпліны літаратуразнаўства. | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі.<br>29.10.2024, Пратакол № 3 |
| «Філалагічны аналіз мастацкага тэксту» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Літаратурна-мастацкі твор як аб’ект літаратуразнаўчага краіназнаўства» шырока карыстацца літаратуразнаўчым тэрміналагічным апаратам. | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі.<br>29.10.2024, Пратакол № 3 |
| «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | У працэсе вывучэння тэмы «Гісторыя станаўлення і развіцця комлекснага і літаратуразнаўчага краязнаўства ў Беларусі » апеляваць да ведаў атрыманых студэнтамі на занятках па «Гісторыі беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стагоддзяў» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі.<br>29.10.2024, Пратакол № 3 |
| «Вусная народна творчасць» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Прапаноў няма | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | падрыхтоўкі.<br>29.10.2024, Пратакол № 3 |
| «Методыка выкладання беларускай літаратуры» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Прапаноў няма | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі.<br>29.10.2024, Пратакол № 3 |